# МАТЕРІАЛИ VIII ПОТЕБНЯНСЬКИХ ЧИТАНЬ, ПРИСВЯЧЕНИХ 18О-РІЧЧЮ ВІД ДНЯ НАРОДЖЕННЯ О. О. ПОТЕБНІ

А. А. ЛУКАШАНЕЦ

## НАЦЫЯНАЛЬНАЯ МОВА І ГОДНАСЦЬ АСОБЫ І НАЦЫІ (беларускія рэаліі)

У артыкуле раскрываецца роля беларускай мовы ў фарміраванні і падтрыманні нацыянальнай свядомасці беларусаў, паказваецца месца ў сучаснай камунікатыўнай і культурнай прасторы Беларусі, абгрунтоўваецца яе роля як фактару псіхалагічнага камфорту асобы і годнасці нацыі ў двухмоўным соцыуме, а таксама прапануюцца канкрэтныя крокі па павышэнні беларускамоўнай кампетэнцыі грамадства, выкарыстанні беларускай мовы як дзяржаўнай мовы краіны ў асноўных сферах зносін і выкананні ёю ролі фактару годнасці асобы і нацыі.

Ключавыя словы: нацыянальная мова, дзяржаўнае двухмоўе, моўная кампетэнцыя, сфера камунікацыі, годнасць нацыі.

А. А. Патабня ў сваіх лінгвістычных працах неаднаразова звяртаўся да праблем нацыянальнай мовы ў жыцці народнасці і нацыі, падкрэсліваў ролю нацыянальнай мовы для захавання самабытнасці народа, бачыў у шматстайнасці моў і культур аснову эвалюцыі чалавецтва. У прыватнасці, ён адзначаў, што нацыянальная мова з'яўляецца неад'емнай формай праяўлення нацыянальнай самасвядомасці, а адмова ад нацыянальнай мовы азначае страту народам сваёй адметнасці, вядзе да дэнацыяналізацыі [1]. В. А. Грэчка сцвярджае, што А. А. Патабня як паслядоўнік В. Гумбальта «быў перакананым праціўнікам канцэпцыі зліцця нацый і моў...» [2], «выступаў за паважлівыя адносіны да моў малых народаў, а таксама да гаворак і дыялектаў аднаго і таго ж народа» [3].

Навуковыя ідэі А. А. Патабні, вельмі надзённыя для моўнага жыцця ўсходнеславянскіх народаў у XIX — пачатку XX ст., не трацяць сваёй актуальнасці і ў наш час. Прыкладам гэтага з'яўляецца гісторыя развіцця і функцыянавання беларускай мовы, моўная сітуацыя ў Беларусі ў пачатку XXI ст. і месца і роля беларускай мовы ў сучаснай камунікатыўнай, культурнай і інфармацыйнай прасторы беларускага грамадства.

Мэтай артыкула з'яўляецца разгляд месца і ролі нацыянальнай беларускай мовы ў сучаснай камунікатыўнай, культурнай і інфармацыйнай прасторы, а таксама яе значэння як фактару годнасці асобы і нацыі ў сітуацыі блізкароднаснага беларуска-рускага дзяржаўнага двухмоўя.

---

[1] *Федоренко А. А.* Проблема взаимосвязи языка и народа в творчестве А. А. Потебни и Н. С.Т рубецкого : Историко-философ. анализ : Автореф. дис. … канд. философ. наук.— М., 2005.— 22 с.

[2] *Гречко В. А.* Роль языка в концепции народности А. А. Потебни // О. О. Потебня й актуальні питання мови та культури : Зб. наук. праць.— К., 2004.— С. 26.

[3] Там сама.— С. 37.

© А. А. ЛУКАШАНЕЦ, 2015

**1. Нацыянальная мова і нацыя.** Нягледзячы на актывізацыю сучасных працэсаў інтэграцыі і глабалізацыі, імклівае пашырэнне сучасных інфармацыйных тэхналогій, якія фактычна вядуць да стварэння адзінай сусветнай культурнай і інфармацыйнай прасторы, нацыянальныя мовы застаюцца не толькі важнейшым сродкам камунікацыі, але таксама з'яўляюцца важнейшай часткай нацыянальнай культуры, сродкам яе стварэння і прэзентацыі, сімвалам нацыянальна-этнічнай прыналежнасці і самаідэнтыфікацыі асобы. Безумоўна, важнейшай функцыяй любой натуральнай мовы па-ранейшаму з'яўляецца камунікатыўная, якая забяспечвае жыццядзейнасць і ўзаемадзеянне соцыуму. Аднак ва ўмовах двухмоўя і шматмоўя функцыі і роля нацыянальнай мовы істотна ўскладняюцца, змяняецца таксама размеркаванне гэтых функцый. У шматмоўных калектывах у залежнасці ад розных сацыяльна-палітычных абставін часта нацыянальная мова аказваецца недастаткова запатрабаванай як сродак зносін, але набывае новую, надзвычай важную сацыяльную функцыю годнасці асобы і нацыі. Гэта абумоўлена перш за ўсё нацыястваральнай функцыяй мовы, а таксама яе значэннем для фарміравання і падтрымання нацыянальнай свядомасці народа, захавання яго адметнасці, на што звяртаў увагу ў свой час А. А. Патабня.

Невыпадкова фарміраванне большасці сучасных еўрапейскіх нацый, у тым ліку і славянскіх, адбывалася паралельна з фарміраваннем нацыянальных моў і ўзмацненнем іх ролі ў жыцці грамадства, пашырэннем літаратурна-пісьмовай традыцыі, а таксама ўвядзеннем нацыянальных моў у якасці сродку зносін у важнейшыя сферы афіцыйнага ўжытку.

Так, нацыянальнае адраджэнне славянскіх народаў у XVII — XIX стст. праходзіла перш за ўсё пад знакам адраджэння (і нават стварэння!) нацыянальных моў і фарміравання іх літаратурных норм, што адбывалася паралельна з нацыянальна-вызваленчым рухам славянскіх народаў, якія знаходзіліся ў складзе буйнейшых тагачасных імперый, і барацьбой за сваю незалежнасць. У якасці прыкладу можна прывесці Чэхію, Балгарыю, Беларусь, Украіну, дзе імклівы рост нацыянальнай свядомасці быў у многім абумоўлены інтэнсіўным фарміраваннем новых літаратурна-пісьмовых моў гэтых славянскіх народаў, паколькі страта гэтымі народамі сваёй дзяржаўнасці ў папярэдні перыяд прывяла да заняпаду калісьці багатай пісьмовай традыцыі. Напрыклад, сучасная чэшская мова сфарміравалася на аснове старачэшскай мовы толькі ў XVIII ст., украінская — у XIX, новая літаратурна-пісьмовая беларуская мова — у канцы XIX — пачатку XX стст. Нацыянальна-вызваленчая барацьба паўднёваславянскіх народаў супраць асманскага прыгнёту стварыла ўмовы для фарміравання новых літаратурна-пісьмовых моў балгар і сербаў.

Прыкладам барацьбы заходнееўрапейскага народа за сваю нацыянальную мову і вырашальнай ролі нацыянальнай мовы (асобнага дыялекту) у падтрыманні і захаванні нацыянальнай ідэнтычнасці ў шматмоўнай сітуацыі пры знешнім моўным і палітычным ціску можа служыць Вялікае Герцагства Люксембург падчас Другой сусветнай вайны [4]. Вялікае Герцагства Люксембург, якое было ўтворана па рашэнні Венскага кангрэса 1814 — 1815 гадоў, знаходзілася ў складзе Германскага саюза і ў асабістай уніі з Нідэрландскім каралеўствам. На працягу пэўнага перыяду ў выніку розных тэрытарыяльных змен адбылося выроўніванне этнічнага складу насельніцтва, роднай мовай якога з'яўляецца

[4] *Лукашанец А. А., Михневич А. Е., Щербин В. К.* Общество — язык — политика.— Минск, 1988.— 223 с.

люксембуржская (летцэбургская) мова, што гістарычна ўзыходзіць да дыялекту мозельскай групы нямецкай мовы. На тэрыторыі сучаснага Люксембурга зараз функцыянуюць яшчэ дзве мовы (французская і нямецкая), якія з'яўляюцца дзяржаўнымі. Парадаксальна, але родная мова асноўнага насельніцтва краіны — люксембуржская — так і не змагла заняць раўнапраўнага становішча з французскай і нямецкай мовамі.

Тэндэнцыі да прызнання люксембуржскага дыялекту нацыянальнай мовай дзяржавы Люксембург найбольш выразна выявілася к сярэдзіне XIX ст. Аднак толькі ў 1912 годзе люксембуржская мова была ўключана ў якасці вучэбнага прадмета ў праграму пачатковай школы, а таксама было прынята рашэнне аб распрацоўцы люксембуржскай арфаграфіі. Усё гэта добра адлюстроўвае ступень росту нацыянальнай самасвядомасці люксембуржцаў.

Паказальна, што ў 1941 годзе, калі нацысты праводзілі перапіс насельніцтва, у графе «родная мова» люксембуржцы аднадушна ўказалі люксембуржскую мову, прадэманстраваўшы тым самым ролю нацыянальнай мовы як фактару нацыянальнага адзінства перад пагрозай прымусовага анямечвання.

Сёння моўная сітуацыя ў Люксембургу характарызуецца адваротнымі суадносінамі грамадскай значнасці суіснуючых моў і іх рэальнай распаўсюджанасцю ў розных сферах грамадскага жыцця. У адпаведнасці з распараджэннем Міністэрства народнай асветы Люксембурга люксембуржская мова разглядаецца як літаратурная дзяржаўная мова краіны. Яна выкарыстоўваецца ў прамовах, прывітаннях, выступленнях у палаце дэпутатаў, у муніцыпальных саветах, у радыё- і тэлеперадачах, на сцэне, у пропаведзях. У гэтых сферах яна канкурыруе з французскай і нямецкай мовамі. Акрамя таго, люксембуржская мова пераважае ў розных сферах паўсядзённых зносін. Аднак яна практычна не выкарыстоўваецца ў пісьмовым маўленні і застаецца, фактычна, сродкам вусных зносін нацыі.

Такім чынам, люксембуржская мова — родная мова асноўнага насельніцтва краіны, хаця і не стала поўнафункцыянальнай мовай і не здолела замяніць у радзе важнейшых сфер зносін французскую і нямецкую мовы, застаецца важнейшым фактарам нацыянальнай кансалідацыі і нацыянальнага адзінства.

XX ст. паказвае і іншыя прыклады высокай нацыяаб'яднальнай ролі моў у розных моўных сітуацыях на розных кантынентах. Так, мова гуарані — мова карэннага насельніцтва Парагвая (Лацінская Амерыка) — з'яўляецца такой жа прэстыжнай, як і афіцыйная іспанская мова. Сёння ў Парагваі мова гуарані з'яўляецца нацыянальнай мовай краіны, якая выкарыстоўваецца ў розных сферах грамадскага жыцця, праўда, пераважна ў вуснай форме.

У наш час з'яўленне на палітычнай карце Еўропы новых дзяржаўных утварэнняў служыць магутным стымулам для развіцця новых нацыянальных моў і станаўлення іх літаратурных норм. Прыкладам могуць служыць новыя славянскія краіны на тэрыторыі былой Югаславіі. Так, у 1991 годзе адбылося канчатковае размежаванне сербска-харвацкай мовы на сербскую, якая стала дзяржаўнай мовай Саюзнай дзяржавы Сербіі і Чарнагорыі, і харвацкую — дзяржаўную мову Рэспублікі Харватыя. Стварэнне на тэрыторыі былой Югаславіі яшчэ адной суверэннай дзяржавы — Босніі і Герцагавіны — стала ўмовай для адгалінавання ад сербскай мовы такой новай мовы, як баснійская (басняцкая). Нарэшце, ужо ў XXI ст. падзел Саюзнай дзяржавы Сербіі і Чарнагорыі на дзве суверэнныя краіны паклала пачатак фарміраванню яшчэ адной паўднёваславянскай мовы — чарнагорскай.

Наяўнасць у сучаснай Іспаніі побач з дзяржаўнай іспанскай (кастальяна) асобных рэгіянальных галісійскай, каталонскай і баскскай моў не толькі з'яўляецца важнейшым фактарам этнічнай кансалідацыі іх носьбітаў, але і служыць стымулам для руху адпаведных правінцый у бок дзяржаўнай незалежнасці.

Такім чынам, вопыт моўнага жыцця Еўропы і ў цэлым свету на працягу XX — XXI ст. паказвае, што ні адна нацыя, якая атрымала сваю дзяржаўнасць, не страціла сваёй нацыянальнай мовы. Наадварот, наяўнасць сваёй нацыянальнай мовы стымулюе рух да нацыянальнай незалежнасці, а набыццё гэтай незалежнасці, як правіла, вядзе да павышэння ролі нацыянальнай мовы ў грамадстве, да развіцця і ўдасканалення яе літаратурных норм, абагачэння слоўнікавага складу і нават да фарміравання новай нацыянальнай мовы.

**2. Беларуская мова** — адна са славянскіх моў усходнеславянскай падгрупы, нацыянальная мова беларускага народа, дзяржаўная мова Рэспублікі Беларусь і мова тытульнай нацыі — таксама развіваецца ў адпаведнасці са згаданымі вышэй тэндэнцыямі і ў розныя перыяды свайго гістарычнага існавання адыгрывала і працягвае адыгрываць зараз важную ролю ў жыцці беларускага народа.

**2.1. Беларуская мова ў гісторыі беларускага народа.** Беларуская мова прайшла дастаткова працяглы і складаны шлях свайго развіцця і займае зараз належнае месца сярод славянскіх моў і на лінгвістычнай карце Еўропы. Сёння беларуская мова — гэта высокаразвітая літаратурная мова з багатым слоўнікавым складам і распрацаванай сістэмай норм, якая можа паспяхова абслугоўваць усе камунікатыўныя патрэбы сучаснага грамадства. Яна па-ранейшаму застаецца важнейшым элементам беларускай культуры, сімвалам нацыянальнай свядомасці, фактарам нацыянальнай адметнасці і ідэнтыфікацыі.

На працягу ўсяго свайго існавання беларуская мова адыграла выключную ролю ў гісторыі беларускага народа, у станаўленні яго нацыянальнай свядомасці і дзяржаўнасці. Вядома, што ў Вялікім Княстве Літоўскім беларуская мова таго часу (старабеларуская) выконвала ўсе функцыі дзяржаўнай мовы, выкарыстоўвалася ва ўсіх сферах жыцця тагачаснага грамадства (ад побытавай да дзяржаўнага справаводства), што, безумоўна, садзейнічала і ўдасканаленню сістэмы самой мовы, развіццю яе слоўнікавага складу. Менавіта ў гэты перыяд былі створаны шматлікія духоўныя каштоўнасці, якія маюць беларускамоўнае ўвасабленне і складаюць значную частку сусветнай культуры. Для пацвярджэння гэтага дастаткова прывесці толькі такія прыклады: менавіта на старабеларускай мове была створана фактычна першая еўрапейская канстытуцыя — Статут Вялікага Княства Літоўскага; Літоўская метрыка — звод дзелавых дакументаў Вялікага Княства Літоўскага, напісаных таксама на старабеларускай мове, — складае больш за 550 тамоў. У гэты перыяд актыўна развіваліся разнастайныя жанры мастацкага пісьменства, рэлігійная літаратура. У навуковых цэнтрах Еўропы і ўсяго свету захоўваюцца шматлікія помнікі старабеларускага пісьменства, дзякуючы якім пра Беларусь і беларускі народ ведаюць іншыя народы Еўропы і свету.

Беларуская народна-гутарковая мова дазволіла беларусам захаваць і паглыбіць сваю нацыянальную адметнасць і ў тыя неспрыяльныя часы, калі пісьмовая разнавіднасць беларускай мовы аказалася пад забаронай і на некалькі стагоддзяў былі прыпынены традыцыі беларускага пісьменства. Менавіта ў гэты перыяд вельмі актыўна развіваліся фальклорныя жанры беларускай духоўнай культуры, якія таксама маюць беларускамоўнае ўвасабленне. Агульнапрызнана, напрыклад, што беларускія народныя казкі займаюць адметнае месца ў славян-

скім фальклоры па багацці сюжэтаў і разнастайнасці жанраў. Менавіта інтэнсіўнае развіццё вуснай беларускай мовы ў XVIII—XIX стст. абумовіла той факт, што якраз народна-гутарковая мова стала базай новай літаратурнай мовы, нормы якой асабліва інтэнсіўна складваліся ў канцы XIX — пачатку XX ст.

Выключна важнай была гэтая роля беларускай мовы ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці ў пачатку XX ст. Сапраўды, нацыянальнае адраджэнне беларусаў у XIX ст. пачалося менавіта з адражэння мовы, са стварэння новай літаратурна-пісьмовай мовы. Дзякуючы літаратурнай творчасці многіх выдатных дзеячаў беларускай культуры, сярод якіх выключнае месца займаюць постаці Максіма Багдановіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа, беларускае пісьмовае слова шырока распаўсюдзілася па ўсёй тэрыторыі Паўночна-заходняга краю Расійскай імперыі, а сама беларуская мова набыла ўсе прыкметы літаратурнай мовы. Гэта было выключна важна, таму што ў дадзеным выпадку спрацавала формула: ёсць самастойная літаратурная мова — ёсць народ з уласнай адметнай культурай і мовай, які мае права на сваю дзяржаўнасць. Несумненна, гэтая акалічнасць, магчыма, ў першую чаргу стала асноўным аргументам на карысць стварэння БССР у 1918 годзе.

**2.2. Беларуская мова ў сучасным беларускім соцыуме.** Усім сваім развіццём на працягу XX ст. беларуская мова даказала ўласную жыццёвасць і неабходнасць. Нягледзячы на многія складанасці і праблемы, асаблівасці моўнай сітуацыі, яна заўсёды была асноўным фактарам падтрымання нацыянальнай культуры і нацыянальнай свядомасці народа, што дазволіла беларусам захаваць сваю нацыянальную адметнасць і спецыфіку ў сучасным шматмоўным і шматкультурным свеце.

У сучаснай сітуацыі дзяржаўнага беларуска-рускага двухмоўя беларуская мова як адзін з кампанентаў моўнай сітуацыі сёння з’яўляецца: а) сродкам зносін (выконвае камунікатыўную функцыю); б) сродкам і часткай беларускай духоўнай культуры, яе асноўным нацыянальным кампанентам; в) сродкам і сімвалам нацыянальнай ідэнтыфікацыі і фактарам нацыянальнай самасвядомасці беларусаў; г) фактарам годнасці нацыі.

*Беларуская мова як сродак зносін.* У сучаснай моўнай сітуацыі камунікатыўная функцыя беларускай мовы істотна абмежавана. Нягледзячы на статус дзяржаўнай мовы яна, на жаль, не займае ў большасці камунікатыўных сфер жыцця сучаснага грамадства таго месца, якое павінна займаць дзяржаўная мова. Больш таго, у многіх сферах ужытку яна выкарыстоўваецца толькі сімвалічна. Аднак, нягледзячы на абмежаванае выкарыстанне беларускай мовы ў радзе найбольш важных і прэстыжных сферах ужытку, сёння няма падстаў гаварыць пра беларускую мову як мову з абмежаванымі функцыямі ў сучасным грамадстве. Па-першае, беларуская мова распаўсюджана і функцыянуе на ўсёй тэрыторыі дзяржавы. Па-другое, з беларускай мовай у той ці іншай ступені сутыкаецца пастаянна кожны грамадзянін краіны. Нават не карыстаючыся актыўна беларускай мовай у сваёй паўсядзённай дзейнасці, кожны, хто жыве на тэрыторыі Беларусі, фактычна штодзённа атрымлівае тую ці іншую інфармацыю на беларускай мове. Усё гэта ў цэлым стварае спрыяльную базу для пашырэння беларускай мовы ў актыўным ужытку.

Сёння нацыянальная беларуская мова прадстаўлена такімі сваімі разнавіднасцямі, як літаратурная мова, народныя гаворкі (фактычна рэшткі сістэмы традыцыйных народных гаворак), сацыяльныя дыялекты (камп’ютарны і маладзёжны слэнг і інш.), змешанае вуснае маўленне (так званая «трасянка»), якая ў

значнай ступені ў сучаснай камунікатыўнай прасторы пачынае выконваць ролю гарадскога прастамоўя. Асаблівасцю сучаснай моўнай сітуацыі з'яўляецца паралельнае функцыянаванне двух варыянтаў беларускай літаратурна-пісьмовай мовы: агульналітаратурнага стандарту (вывучаецца ў школе, выкарыстоўваецца ў афіцыйных сферах ужытку, у першую чаргу ў пісьмовай разнавіднасці) і так званай «тарашкевіцы» (паралельнага варыянту літаратурна-пісьмовай мовы, які арыентаваны на правапісныя нормы «Беларускай граматыкі для школ» Браніслава Тарашкевіча (1918) і пісьмовую практыку беларускамоўнага замежжа і характарызуецца асаблівасцямі фанетыкі, слоўнікавага складу, марфалагічных, сінтаксічных і словаўтваральных норм).

Феноменам развіцця сістэмы беларускай мовы ў пачатку XXI ст. з'яўляецца адначасовая актывізацыя дзвюх асноўных тэндэнцый, якія вызначаюць сучаснае развіццё практычна ўсіх славянскіх моў: тэндэнцыі да інтэрнацыяналізацыі (інтэнсіўнае папаўненне лексікону сучаснымі запазычаннямі, пераважна з англійскай мовы, і актыўнае ўтварэнне вытворных адзінак на базе гэтых запазычанняў) і тэндэнцыя да нацыяналізацыі (актывізацыя ў маўленні нацыянальна адметных моўных адзінак, якія адрозніваюць беларускую мову ад перш за ўсё рускай мовы; гэтая тэндэнцыя з'яўляецца фактычна рэакцыяй на папярэдні этап развіцця сістэмы беларускай мовы і накіравана ў пэўнай ступені на нарматыўную рэвізію існуючых у мове лексічных сродкаў).

Парадоксам сучаснага існавання беларускай мовы ў камунікатыўнай прасторы беларускага грамадства з'яўляецца яе абмежаванае выкарыстанне ў большасці афіцыйных сфер зносін, дзе яна павінна функцыянаваць як дзяржаўная мова краіны, і адначасовае пашырэнне ў новыя камунікатыўныя сферы, такія, як, напрыклад, канфесійная і інтэрнэт-камунікацыя. Больш таго, па звестках замежных спецыялістаў, беларуская мова сёння адносіцца да той групы моў свету, якія дастаткова шырока прадстаўлены ў сетцы інтэрнэт, пры тым, што больш за 96 % моў свету ў інтэрнэце наогул не выкарыстоўваюцца (з'яўляюцца фактычна мёртвымі для гэтай сучаснай сферы камунікацыі).

*Беларуская мова ў культурнай прасторы беларусаў.* Не менш важнай з'яўляецца роля беларускай мовы ў культурнай прасторы беларусаў. Увогуле культурная прастора беларусаў мае даволі складаную структуру і аб'ядноўвае разнастайныя пласты, якія па-рознаму суадносяцца з беларускай мовай. Як уяўляецца, гэтая прастора беларусаў можа разглядацца ў двух аспектах: дыяхронным (вертыкальны зрэз) і сінхронным (гарызантальны зрэз). У дыяхронным аспекце культурная прастора беларусаў ахоплівае культурныя набыткі ўсіх часоў і эпох. Паколькі ў дадзеным выпадку істотнае месца належыць пісьмовым помнікам культуры, гэты аспект прэзентуе не толькі сучасная беларуская літаратурная мова, але і яе гістарычныя разнавіднасці, у першую чаргу старабеларуская мова, на якой захавалася велізарная колькасць пісьмовых помнікаў, што ўваходзяць у залаты фонд не толькі беларускай, але і сусветнай культуры. Акрамя таго, гістарычны аспект культурнай прасторы беларусаў таксама прэзентуецца царкоўнаславянскай мовай, а таксама іншымі мовамі, што існавалі на тэрыторыі Беларусі ў розныя гістарычныя эпохі (лацінскай, польскай, рускай і інш.).

Сінхронны аспект праблемы культурнай прасторы беларусаў ахоплівае ўсё культурнае поле, усе здабыткі духоўнай і матэрыяльнай культуры, якія даступны сучаснаму беларускаму грамадству. Таму на сучасным этапе больш складанай з'яўляецца і сама культурная прастора беларусаў, і больш складанымі з'яўляюцца суадносіны мовы і культуры. Апошняе ў першую чаргу абумоўлена асаблівасцямі моўнай сітуацыі ў нашай краіне. Так, відаць, будзе правільным

умоўна падзяліць культурную прастору беларусаў на дзве часткі: уласна беларускую (уласна нацыянальную) і інтэрнацыянальную (іншанацыянальную). Першая частка ахоплівае культурныя здабыткі, створаныя беларусамі, і тут варта выдзяляць каштоўнасці агульнанацыянальнага плана і каштоўнасці рэгіянальнага плана. Другая частка ахоплівае культурныя здабыткі іншых народаў (суседніх і несуседніх), уключаных у сферу кампетэнцыі беларускага грамадства. У сукупнасці ўсе гэтыя часткі культуры складаюць адзіную культурную прастору беларусаў і фарміруюць беларускую нацыянальную культуру ў шырокім сэнсе.

Мова як сродак зносін з'яўляецца, з аднаго боку, часткай культуры народа, у тым ліку і нацыянальнай. З другога боку, мова з'яўляецца сродкам стварэння і выражэння многіх іншых частак, у першую чаргу духоўнай культуры народа. Таму ў сучаснай моўнай сітуацыі абсалютна заканамерным з'яўляецца пытанне аб месцы і ролі беларускай мовы ў агульнай культурнай прасторы беларусаў. Адразу трэба заўважыць, што культурную прастору беларусаў сёння абслугоўваюць пераважна дзве мовы — беларуская і руская. Пры гэтым беларуская мова выступае ў дзвюх сваіх асноўных разнавіднасцях: літаратурная мова і народныя гаворкі. Руская мова выкарыстоўваецца пераважна ў літаратурнай форме (дакладней, варыянце, набліжаным да літаратурнага стандарту).

Беларуская мова абслугоўвае ў першую чаргу ўласнабеларускі кампанент культурнай прасторы. Пры гэтым адчуваецца выразнае размежаванне выкарыстання літаратурнага варыянту і народных гаворак. Літаратурная мова звязана з так званай агульнанацыянальнай часткай культуры, народныя гаворкі — з рэгіянальнай (песні, найперш абрадавыя, іншыя віды вуснай народнай творчасці). У гэтых адносінах рэгіянальна-моўныя асаблівасці традыцыйных форм культуры служаць своеасаблівым сродкам мясцовай (лакальнай) ідэнтыфікацыі беларусаў.

Беларуская літаратурная мова ў значнай ступені суадносіцца і з інтэрнацыянальнай (іншанацыянальнай) часткай культуры беларусаў. У першую чаргу гэта тычыцца перакладаў на беларускую мову літаратурных твораў народаў свету, навуковая інфармацыя, энцыклапедычныя і іншыя даведнікі па розных галінах навукі і культуры. Разам з тым трэба прызнаць, што ў дадзенай сферы роля беларускай мовы істотна абмежавана.

Іншанацыянальная (інтэрнацыянальная, агульначалавечая) частка культурнай прасторы беларусаў у сучасным грамадстве абслугоўваецца пераважна рускай мовай. Шырокае выкарыстанне рускай мовы як сродку зносін, культурнага кампанента і сродку прэзентацыі іншых відаў культуры садзейнічае ў першую чаргу істотнаму павелічэнню рускага нацыянальнага культурнага кампанента ў агульнай культурнай прасторы беларусаў. Зразумела, што менавіта рускай мовай у сучасным беларускім грамадстве ў асноўным маркіравана інтэрнацыянальная (іншанацыянальная) частка культурнай прасторы беларусаў.

Як можна бачыць, культурная прастора беларусаў з'яўляецца мнагамернай і шматпланавай і прадстаўлена ў сучасным грамадстве пераважна дзвюма асноўнымі мовамі (беларускай і рускай). Шырокае выкарыстанне рускай мовы, з аднаго боку, істотна пашырае межы культурнай прасторы беларусаў, аднак, з другога боку, аб'ектыўна звужае нацыянальна-моўны кампанент гэтай прасторы. Таму вельмі важна ў эпоху інтэнсіўнай глабалізацыі падтрымліваць і ўмацоўваць менавіта ўласнабеларускі пласт нацыянальнай культуры беларусаў.

*Беларуская мова як сродак і сімвал нацыянальнай ідэнтыфікацыі і фактар нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.* Ва ўмовах білінгвізму і паралельнага функцыянавання ў грамадстве дзвюх моў асабліва ўзрастае роля нацыянальнай мовы (у нашым выпадку беларускай) як сродку нацыянальнай свядомасці і ідэнтыфікацыі.

Нацыянальная моўная ідэнтыфікацыя цесна звязана з такімі паняццямі, як моўная дыферэнцыяцыя і моўная інтэграцыя, таму што, ідэнтыфікуючы сябе па моўнай прымеце з адной супольнасцю, індывід адначасова адмяжоўваецца ад іншых. Таму пры разглядзе ідэнтыфікацыйнай ролі беларускай мовы ў сучасным грамадстве неабходна ўлічваць наступныя аспекты.

1. Трэба адрозніваць, на наш погляд, знешні і ўнутраны аспекты моўнай ідэнтыфікацыі асобы. Пра знешнюю ідэнтыфікацыю варта гаварыць тады, калі па мове індывіда адносяць да той ці іншай нацыянальнасці (культурна-моўнай супольнасці). Іншымі словамі, знешняя ідэнтыфікацыя звязана з ацэнкай моўных паводзін індывіда іншымі індывідамі. Унутраная ідэнтыфікацыя (самаідэнтыфікацыя) — гэта патрэбнасць самой асобы праз адносіны да мовы атаясамліваць сябе з той ці іншай нацыянальнай культурай, той ці іншай нацыяй. Знешняя ідэнтыфікацыя, такім чынам, патрабуе актыўнага карыстання мовай. Унутраная ж ідэнтыфікацыя (самаідэнтыфікацыя) не абавязкова звязана з актыўным выкарыстаннем мовы ў якасці сродку зносін. Тут галоўным з'яўляецца дэкларатыўны аспект. Безумоўным з'яўляецца той факт, што ў сучаснай моўнай сітуацыі незвычайна ўзрастае роля беларускай мовы менавіта як фактару ўнутранай ідэнтыфікацыі (самаідэнтыфікацыі).

2. Мова з'яўляецца важным, але не адзіным (і, магчыма, не галоўным) фактарам нацыянальнай ідэнтыфікацыі, аднак у сучаснай моўнай сітуацыі ў Беларусі менавіта беларуская мова прэтэндуе на ролю фактычна адзінага маркера нацыянальнай ідэнтыфікацыі і самаідэнтыфікацыі асобы і нацыі.

3. Значнасць ролі мовы як фактару нацыянальнай ідэнтыфікацыі залежыць ад яе статусу і ступені распаўсюджанасці. Пры гэтым часта назіраецца адваротная залежнасць: чым ніжэйшы статус мовы і менш распаўсюджана яна ў грамадстве, тым вышэйшай з'яўляецца яе ідэнтыфікацыйная роля. У пачатку XXI стагоддзя заканадаўчы статус беларускай мовы дазваляе ёй максімальна выконваць сваю нацыяідэнтыфікацыйную функцыю, аднак блізкароднасны характар дзяржаўнага двухмоўя ў краіне і ўзровень беларускамоўнай кампетэнцыі грамадства не дазваляе ёй максімальна рэалізаваць свой патэнцыял у гэтых адносінах.

4. Ступень нацыянальнай ідэнтыфікацыі натуральнай мовы цесна звязана з наяўнасцю яе падсістэм і агульналітаратурнага стандарту. Так, у сучаснай моўнай сітуацыі беларуская літаратурная мова забяспечвае ўзровень агульнанацыянальнай ідэнтыфікацыі, мясцовыя народныя гаворкі — узровень лакальнай (мясцовай) ідэнтыфікацыі.

5. Наяўнасць дзвюх і больш разнавіднасцей літаратурна-пісьмовай мовы. Так, па тым, які варыянт літаратурна-пісьмовай беларускай мовы выкарыстоўвае асоба, мы можам меркаваць аб яе моўных прыярытэтах і поглядах на шляхі развіцця беларускай мовы і яе норм. Гэты аспект набывае асаблівую актуальнасць у сучаснай моўнай сітуацыі Беларусі, паколькі ідэнтыфікацыя асобы па моўнай прыкмеце ўскладняецца наяўнасцю паралельнага варыянта літаратурна-пісьмовай беларускай мовы (тарашкевіцы), якая служыць не толькі найбольш выразным фактарам агульнанацыянальнай (беларускай!), але і групавой (карпаратыўнай) ідэнтыфікацыі.

Такім чынам, на пачатку XXI ст. у сітуацыі дзяржаўнага беларуска-рускага двухмоўя беларуская мова працягвае адыгрываць істотную ролю ў жыцці беларускага грамадства як сродак камунікацыі, важнейшы складнік нацыянальнай беларускай культуры і сродак нацыянальнай ідэнтыфікацыі і самаідэнтыфікацыі.

*Беларуская мова як фактар годнасці нацыі і асобы.* Функцыя беларускай мовы ў сучасным беларускім грамадстве як фактару годнасці асобы і нацыі на пачатку XXI ст. істотна актуалізуецца, паколькі звязана з цэлым шэрагам аспектаў сацыяпсіхалагічнага характару, якія забяспечваюць камфортнае і бесканфліктнае існаванне асобы ў двухмоўным асяроддзі.

На жаль, у сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя недастатковая запатрабаванасць беларускай мовы як рэальнага сродку камунікацыі прыводзіць да недаацэнкі яе ролі як фактару годнасці і самадастатковасці асобы і сучаснага беларускага грамадства ў цэлым, а таксама прыводзіць часта да індывідуальнага і калектыўнага псіхалагічнага дыскамфорту ў канкрэтных маўленчых сітуацыях. Таму актуальнасць фарміравання станоўчага іміджу беларускай мовы ў грамадстве і забеспячэнне яе паўнацэннага функцыянавання ў важнейшых сферах сучаснай камунікацыі як дзяржаўнай мовы набывае асаблівую вастрыню, паколькі датычыцца як індывідуальнай, так і калектыўнай псіхалогіі ў сферы моўных паводзін.

Сапраўды, калі сёння роля беларускай мовы як рэальнага сродку камунікацыі фактычна зведзена да мінімуму, большасць грамадзян нашай краіны з лёгкасцю карыстаюцца ў зносінах рускай мовай і не адчуваюць пільнай патрэбы ведаць беларускую мову і карыстацца ёю. Але ў той жа час у сітуацыі дзяржаўнага беларуска-рускага двухмоўя няведанне беларускай мовы рэальна стварае пэўны псіхалагічны дыскамфорт для аднамоўных рускамоўных асоб (унікальнасць сучаснай моўнай сітуацыі ў Беларусі заключаецца ў тым, што аднамоўнымі, як правіла, з'яўляюцца асобы, якія актыўна валодаюць толькі рускай мовай). У сітуацыі двухмоўя яны рэгулярна трапляюць у беларускамоўнае асяроддзе, калі пажадана размаўляць па-беларуску, сутыкаюцца з інфармацыяй на беларускай мове і г. д. Немагчымасць жа паводзіць сябе ў адпаведнасці з маўленчай сітуацыяй, безумоўна, стварае пэўны псіхалагічны дыскамфорт, хаця і не прыводзіць да канфліктаў у плане ўзаемапаразумення. Гэты моўны дыскамфорт звычайна знаходзіць сваё выражэнне ў двух аспектах: 1) памяркоўна-лаяльным («Прабачце, але можна я буду гаварыць па-руску»); 2) агрэсіўна-негатыўным («Беларуская мова не патрэбна!», «Беларускай мовы не існуе наогул!» і г. д.). У дадзеным выпадку падсвядома спрацоўвае стэрэатып: раз я не ведаю беларускай мовы і не карыстаюся ёю, дык і іншыя не павінны яе ведаць і размаўляць па-беларуску.

Аднак праблема калектыўнай годнасці і самадастатковасці нацыі ў нацыянальна-моўным ракурсе мае і больш сур'ёзныя пагрозы.

Перспектыва поўнага выцяснення беларускай мовы з грамадскага ўжытку непазбежна прывядзе да фарміравання пачуцця асабістай і калектыўнай віны перад сваімі продкамі і нашчадкамі за страту сваіх нацыянальных сімвалаў і каштоўнасцей, а таксама да комплексу нацыянальнай непаўнавартаснасці (унутранай і знешняй) ва ўласных вачах і ў вачах прадстаўнікоў іншых нацый.

Таму сёння перад сучасным беларускім грамадствам стаіць вельмі адказная задача сфарміраваць пазітыўныя адносіны да беларускай мовы, усвядоміць яе ролю як фактару годнасці чалавека ў двухмоўным соцыуме, стварыць умовы, каб кожны грамадзянін краіны ў дастатковай ступені валодаў абедзвюма дзяр-

жаўнымі мовамі, а таксама захаваць сваю нацыянальную беларускую мову, літаратуру і культуру, павысіць іх ролю ў духоўным жыцці сучаснага беларускага грамадства, пашырыць беларускамоўную кампетэнцыю нашага грамадства і выкарыстанне беларускай мовы ва ўсіх сферах афіцыйнага ўжытку. Калі мы гэтага не зробім, то нам не даруюць будучыя пакаленні беларусаў, якія будуць адчуваць сваю нацыянальную «непаўнавартаснасць» за страчаныя нацыянальныя атрыбуты.

У гэтых адносінах выключнае значэнне мае не толькі развіццё сістэмы самой мовы і яе рэальная запатрабаванасць як сродку зносін, але і стварэнне высокамастацкіх твораў на беларускай мове. Роля мастацкага беларускага слова на сучасным этапе з'яўляецца выключна важнай, бо менавіта аўтарытэт нацыянальнай літаратуры, якая адпавядае сусветным тэндэнцыям літаратурнага працэсу, даносіць да сучаснага чытача гістарычна значныя для беларускага народа падзеі і адлюстроўвае актуальныя для жыцця сучаснага беларускага грамадства з'явы рэчаіснасці, фарміруе і адпаведныя адносіны да сродкаў мастацкага выражэння — нацыянальнай беларускай мовы.

Як уяўляецца, роля нацыянальнай беларускай мовы як фактару годнасці асобы і годнасці нацыі ў сучасных сацыялінгвістычных умовах павінна разглядацца ў двух аспектах: унутраным і знешнім.

Унутраны аспект «моўнай» праблемы годнасці нацыі і асобы звязаны з а) адносінамі асобы і нацыі да ўласнай нацыянальнай мовы; б) ацэнкай самой мовы і яе становішча ў грамадстве; в) ацэнкай моўнай кампетэнцыі асобы і нацыі; г) стаўленнем саміх носьбітаў беларускай мовы да сваёй мовы як сродку зносін; е) наяўнасцю ўласнай унутранай матывацыі да выкарыстання беларускай мовы як рэальнага сродку камунікацыі; ж) наяўнасцю ўласнага пачуцця гонару за сваю нацыянальную мову.

Знешні аспект праблемы звязаны з а) адносінамі «звонку» (з боку носьбітаў іншых моў, у першую чаргу, рускай) да нацыянальнай беларускай мовы як рэальнага сродку камунікацыі ў сучасным грамадстве; б) знешняй ацэнкай яе магчымасцей максімальна поўна забяспечваць патрэбы камунікацыі сучаснага інфармацыйнага грамадства і здольнасці выступаць «маркерам» нацыянальнай адметнасці асобы, нацыі і дзяржавы; в) знешняй ацэнкай носьбітаў беларускай мовы па іх адносінах да ўласнай нацыянальнай мовы і моўнай кампетэнцыі, г) ацэнкай функцыянальнай запатрабаванасці мовы.

Такім чынам, у сітуацыі дзяржаўнага, тым больш блізкароднаснага, двухмоўя, роля нацыянальнай мовы (у нашым выпадку беларускай) як фактару нацыянальнай годнасці асобы і нацыі можа быць забяспечана шэрагам умоў: а) лінгвістычных (наяўнасць тэарэтычна-факталагічнай базы і адпаведнай моўнай кампетэнцыі); б) прававых (стварэнне адпаведнага заканадаўчага статусу мовы і прававое ўрэгуляванне моўных праблем жыцця грамадства); в) ідэалагічных (фарміраванне асноўных напрамкаў дзяржаўнай моўнай палітыкі); г) сацыяльна-псіхалагічных (наяўнасць грамадскай волі да падтрымання і ўмацавання сваіх нацыянальных прыярытэтаў).

Такое становішча абумоўлена спецыфікай сучаснай моўнай сітуацыі і рэальным становішчам беларускай мовы ў камунікатыўнай прасторы беларусаў. Дзяржаўнае беларуска-рускае двухмоўе ў адпаведнасці з існуючым моўным заканадаўствам прадугледжвае парытэтнае (раўнапраўнае) выкарыстанне абедзвюх дзяржаўных моў ва ўсіх важнейшых сферах афіцыйнага ўжытку. Аднак асаблівасці сучаснай моўнай сітуацыі ў Беларусі сведчаць аб наяўнасці істотнага дысбалансу паміж афіцыйным статусам беларускай мовы і яе рэальнай запат-

рабаванасцю і выкарыстаннем фактычна ва ўсіх сферах жыцця сучаснага беларускага грамадства. Таму актуальнай задачай дзяржаўнай важнасці з'яўляецца пашырэнне беларускай дзяржаўнай мовы як рэальнага сродку зносін у тыя сферы афіцыйнага ўжытку, у якіх яна павінна выкарыстоўвацца як дзяржаўная мова краіны і мова тытульнай нацыі. Гэта гуманітарная праблема набывае асаблівую значнасць у XXI ст., калі асабліва востра ў міжнароднай супольнасці стаяць пытанні захавання нацыянальнай і культурнай ідэнтычнасці, таму што менавіта нацыянальная мова застаецца найбольш важным і істотным сродкам і фактарам нацыянальнай свядомасці і нацыянальнай адметнасці. Таму паўнацэннае функцыянаванне нацыянальнай мовы народа, асабліва ў сітуацыі двухмоўя і шматмоўя, у якасці рэальнага сродку камунікацыі істотна павышае яе ідэнтыфікацыйныя магчымасці.

*Лінгвістычныя ўмовы* прадугледжваюць абавязковую наяўнасць тэарэтыка-факталагічнай базы і дастатковай моўнай кампетэнцыі асобы і ўсяго грамадства ў цэлым. Першачарговымі ў гэтых адносінах трэба лічыць, безумоўна, наступныя: а) адпаведны ўзровень развіцця сістэмы мовы (наяўнасць літаратурнага стандарту, багатага слоўнікавага складу, распрацаванай навуковай тэрміналогіі, устойлівай пісьмовай традыцыі і стабільнай арфаграфіі, развітай сістэмы словаўтварэння для папаўнення намінатыўных рэсурсаў мовы і г. д.); б) дастатковае тэарэтычнае забеспячэнне (неабходны ўзровень айчыннага мовазнаўства, усебаковае даследаванне і комплекснае манаграфічнае апісанне ўсіх узроўняў моўнай сістэмы, наяўнасць акадэмічных граматык, нарматыўных тлумачальных і іншых слоўнікаў літаратурнай мовы і г. д.); в) наяўнасць факталагічнай базы (комплекс практычных даведнікаў і дапаможнікаў для забеспячэння патрэб навучальнага працэсу і моўнай практыкі: падручнікі і дапаможнікі для ўсіх узроўняў адукацыі, слоўнікі, у тым ліку двухмоўныя, і даведнікі розных тыпаў, у тым ліку і тэрміналагічныя). Усё гэта неабходна для ўсведамлення значнасці і дастатковасці сістэмы нацыянальнай беларускай мовы для забеспячэння камунікатыўных патрэб сучаснага грамадства, а таксама рэальнай магчымасці карыстацца беларускай мовай у сваёй прафесійнай і паўсядзённай дзейнасці.

*Сацыяльныя ўмовы* прадугледжваюць: а) наяўнасць дастаткова шырокай сацыяльнай базы для паўнацэннага функцыянавання беларускай мовы; б) забеспячэнне неабходнай лінгвістычнай кампетэнцыі ўсіх слаёў беларускага грамадства (фактычна ўсе павінны ў дастатковай ступені валодаць навыкамі выкарыстання беларускай мовы). Менавіта гэтыя аспекты забяспечваюць магчымасць і рэальнае права (!) грамадзяніна карыстацца беларускай мовай у сваёй дзейнасці і бесперашкодна атрымліваць любую неабходную інфармацыю на беларускай мове.

*Прававыя ўмовы* (абумоўленыя сітуацыяй двухмоўя) уключаюць: а) наяўнасць нарматыўнай заканадаўчай базы ў сферы моўнага жыцця і яе строгае выкананне; б) прававую кампетэнцыю грамадзян і выкананне моўных абавязкаў службовымі асобамі; в) адпаведнасць нацыянальнага моўнага заканадаўства еўрапейскім стандартам у моўнай сферы. Выкананне гэтых умоў рэгулюе моўныя паводзіны грамадзян і службовых асоб у моўнай сферы.

*Сацыяльна-псіхалагічныя фактары* заключаюцца ў наступным: а) усведамленні важнасці і прыярытэтнасці нацыянальнай мовы як часткі нацыянальнай духоўнай культуры і гістарычнай спадчыны; б) фарміраванні нацыянальнага моўнага этнацэнтрызму і пазбаўленні ад комплексу блізкароднаснага адштур-

хоўвання; в) адносінах да нацыянальнай мовы як да важнейшага атрыбута дзяржаўнасці і незалежнасці краіны; г) выкананні нацыянальнай (беларускай) мовай функцыі аб'яднання грамадства, а не яго канфрантацыі; д) пазбаўленні палітычных ярлыкоў па моўных густах і схільнасцях двухмоўных грамадзян краіны. Гэты найбольш складаны комплекс умоў, звязаны з моўнымі густамі і стэрэатыпамі моўных паводзін, неабходны для фарміравання ў асобы і соцыуму мажарытарных адносін да нацыянальнай беларускай мовы.

Забеспячэнне названых умоў лінгвістычнага, сацыяльнага, прававога і сацыяпсіхалагічнага характару ў цэлым не толькі забяспечыць псіхалагічны камфорт асобы ў двухмоўным соцыуме, але і дазволіць беларускай мове заняць у сучасным беларускім грамадстве тое месца, якое яна павінна займаць як дзяржаўная мова краіны і мова тытульнай нацыі.

Такім чынам, прыклад моўнай сітуацыі ў Беларусі і становішча нацыянальнай беларускай мовы ў сучасным беларускім грамадстве яскрава пацвярджае актуальнасць і важнасць ідэй А. А. Патабні аб ролі нацыянальнай мовы ў жыцці народа і неабходнасці падтрымкі і развіцця так званых малых моў, якія менавіта ў XXI ст. сутыкаюцца з праблемай выжывання і захавання свайго месца ў сусветнай камунікатыўнай прасторы.

*(Мінськ, Білорусь)*

A. A. LUKASHANETS

**NATIONAL LANGUAGE AND THE DIGNITY OF THE INDIVIDUAL AND THE NATION (the reality of Belarus)**

The article reveals the role of Belarusian language in the formation and maintenance of national consciousness of the Belarusians, shows its position in modern communicative and cultural space of Belarus, substantiates its role as a factor of psychological comfort for an individual and dignity of the nation in a bilingual society, and proposes concrete steps to improve the competence of the Belarusian language in society, the use of the Belarusian language as the state language of the country in key spheres of communication and fulfilling the role of the dignity of the individual and the nation.

Keywords: national language, state bilingualism, language competence, sphere of communication, dignity of the nation.